№ 8 ліпень 2003

# Свой Лад

інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Гродзенскага аддзяленьня ГА «Фонд імя Льва Сапегі»

**у нумары:**



**Косьці разладу** с. 8



**уціск на «Новую газэту Смаргоні»** с.9



**Ці ведаеце вы трасянку?** с. 10

## дзень месяца:




аўтары нумару: Андрэй Адляніцкі, Зьміцер Кісель, Алесь Крой, Антон Лабовіч, Сяргей Міронаў, Алег Рамашкевіч, Віктар Сазонаў, Тамара Палховіч, Юры Пацюпа, Уладзімер Хільмановіч

# Халоднае лета 2003 году

*Час - гэта амаль што адзінае, над чым ня можа ўладаць чалавек. Эпоха зьмяняе эпоху, цывілізацыя - цывілізацыю, усё мае свой час. Ён плыве ў вечнасьці, паводле законаў дадзеных Стварцам, і ніхто ня можа ні запаволіць яго, ні прысьпешыць. Чалавек можа толькі выбраць, як скарыстаць гэты прамежак паміж нараджэньнем і сьмерцю, з чым пайсьці ў вечнасьць, і што пакінуць на зямлі па сабе.*

Сьмерць Васіля Быкава яшчэ раз прымусіла задумацца над годнасьцю жыцьця, і цяпер ужо - прымусіла задумацца ўсю нацыю. Гэты Беларус, прыехаў ў апошнія дні свайго жыцьця на Бацькаўшчыну, каб паказаць, што ня толькі быцьцё сьмяротнага чалавека можа быць годным, але нават яго сьмерць. Сьмерць, якая скаланула ўвесь народ. Нават тыя, хто даўно ўжо не выходзілі на вуліцу пад нацыянальнаю сымболікай, на гэты раз не пабаяліся выйсьці. Нават тыя, хто заўсёды каралі за гэтую сымболіку і не дазвалялі нічога нацыянальнага, на гэты раз не адважыліся перашкодзіць. Дзясяткі тысяч людзей прыйшлі разьвітацца, і правесьці ў апошні шлях чалавека, на якога так хацелася быць падобным кожнаму. З усіх куткоў Беларусі прыехалі яе сыны і дочкі, каб пад бел-чырвона-белымі сьцягамі з жалобнымі чорнымі стужкамі, аддаць даніну павагі свайму земляку, і над яго магілай яшчэ раз засьведчыць аб сваім выбары. Выбары быць беларусамі. Выбары быць вольнымі.

Памёр Беларус. Але Жыве Беларусь! Жыве дзякуючы жыцьцю і змаганьню такіх людзей, як Васіль Быкаў. Жыве і будзе жыць вечна.

Па другі бок барыкадаў былі свае клопаты і свае праблемы. Лукашэнка надумаўся паганяць міністраў. Нават пра самога прэм'ера на гэты раз не забыўся. Зразумець начальніка рэспублікі можна. На каго цяпер можна зваліць усе нястачы і хібы беларускай, рынкава-сацыялістычнай мадэлі эканамічнага разьвіцьця, экспэрымэнты па якой праходзяць ў адной, асобна ўзятай краіне? Зноў жа, нашай. На апазыцыю, як раней, ня зваліш. Няма той апазыцыі, што была раней. У тое, што сёньняшняя апазыцыя можа на нешта істотна паўплываць, ніхто не паверыць. Прайшлі тыя часы. А мо яшчэ не надышлі...

“Крывасмокі-прадпрымальнікі” і “заходнія ворагі” таксама даўно “нэўтралізаваныя”. Дык хто ж у рэшце вінаваты ў тым, што сялянам за малако грошай не даюць? Ды і такія там грошы. Ня грошы, а сьлёзы. Засталіся ў сыстэме падняцьця статусу вінаватых толькі міністры. Ну, а калі і цяпер сытуацыя ня стане лепшай, каго тады вінаваціць? Аж падумаць страшна.

Праўда, зусім нядаўна былі часы, калі лічылася, што мэтней мяняць сыстэму гаспадараньня, чым увесь час шукаць ворагаў і няўмекаў ў ужо існай сыстэме. Пачаліся тыя часы з моманту прыняцьця дэклярацыі аб сувэрэнітэце. 27-га ліпеня 1991 году, Вярхоўны савет БССР 12-га скліканьня пад ціскам нацыянальна сьведамае грамадзкасьці і патрыятычных дэпутатаў пастанавіў, што нашая пакутлівая нацыя таксама мае права на годнае жыцьцё ў уласнай дзяржаве. У такой дзяржаве, дзе людзі будуць гаварыць на роднай мове, а не цурацца яе. Дзе будуць свае грошы, а не размовы пра ўвядзеньне чужых. Дзе міністры будуць шанаваныя, паважаныя людзі, а не напалоханыя да сьмерці баязьлівыя чыноўнікі. У такой дзяржаве, дзе грамадзтва шануе і ведае сваю мінуўшчыну, а ня лічыць, што нашая гісторыя пачалася з кастрычніка 1917 году. У дзяржаве, дзе б на самым высокім дзяржаўнам роўні адзначаліся б у ліпені ўгодкі перамогі ў Грунвальдскай бітве, а ня дзень вызваленьня ад адных акупантаў іншымі. Дзе насходзе “Згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына” бытнасьць беларускага прэзыдэнта была б абавязковаю. Дзе беларуская дыяспара за мяжою мела б апеку і падтрыманьне свае гістарычнае бацькаўшчыны, і традыцыйнае БАСовішча, ці Купальле, мелі б большую цікавасьць з боку нашае дзяржавы, чым прапагандысцкі славянскі базар. У такой дзяржаве, пра якую марыў і вялікі сын беларускага народу Васіль Быкаў...



**Віктар Сазонаў**

# Будзе помнік Быкаву ў Гародні!

Кіраўнікі партыяў і рухаў дэмакратычнага кірунку Гародні, аб'яднаныя ў каардынацыйным камітэце “Гарадзенская ініцыятыва”, надумалі прыкласьці агульныя намаганьні, каб увекавечыць імя пісьменьніка Васіля Быкава.

Узьнікла рабочая група. Яна аналізуе прапановы і рыхтуе канчатковы тэкст заявы, якую накіруюць на адрас адміністрацыі гарадзкога выканаўчага камітэту. У дакумэнце гаворыцца аб усталяваньні мэмарыяльнае дошкі на доме, у якім жыў ведамы літаратар, стварэньні музэю Васіля Быкава, наданьні імя пісьменьніка адной з школ гораду, а таксама адной з цэнтральных вуліц.

Ухвалілі ідэю аб усталяваньні ў Гародні помніку Васілю Быкаву. Менавіта тут ён адбыўся як пісьменьнік. Для жыхароў Гародні Быкаў быў чалавекам не чужым. У 1947 годзе працаваў мастаком гарадзкіх мастацкіх майстэрань, стыль-рэдактарам абласной газэты “Гродзенская праўда”. З 1949 па 1955 – служыў у Савецкай Арміі. У 1956 годзе вярнуўся ў Гародню і па 1972 год працаваў літаратурным кансультантам газэты. У 1972-1978 гадох — вызвалены сакратар абласнога аддзяленьня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. З 1978 жыў у Менску.

На чарговай сэсіі гарадзкога Савету дэпутатаў чакаецца агучваньне заявы каардынацыйнага камітэту “Гарадзенская ініцыятыва” дэпутатам Сяргеем Антусевічам.

**Антон Лабовіч**

# Яўген Вапа: “Спадзяваўся дзед на мёд – то лёг спаць ня еўшы”

*6 ліпеня ў менскім Доме літаратара адбылася ўрачыстая вечарына, прысьвечаная 10-ым угодкам першага зьезду і заснаваньня “Згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”. На імпрэзу ў сталіцу як пачэсных гасьцей запрасілі беларусаў з “блізкага замежжа”. Сярод іх быў старшыня Беларускага саюзу ў Польшчы **Яўген Вапа**, выступ якога выклікаў жывы водгук там бытных.*

***- Яўген, што найперш характарызуе жыцьцё беларусаў на Беласточчыне?***

Беларусы на Беласточчыне ёсьць неадымнаю часткай беларускага культурнага арэалу. Гэта нацыянальная меншасьць у іншай дзяржаве, якая мае свае законы, іншае бачаньне сьвету, свае правілы жыцьця. Нам, грамадзянам Польшчы, быцьцё нацыянальнай меншасьцю дае перш за ўсё тое, што мы хочам захоўваць сваю тоеснасьць. Мы як грамадзяне нашай дзяржавы бярэм удзел у грамадзянскім жыцьці Польшчы, і гэта натуральна, бо так, а не інакш склалася гісторыя. Мы хочам быць адказнымі за тое, што робіцца на нашай тэрыторыі, там, дзе жыве найбольш беларусаў, на Беласточчыне. Ня будзем гаварыць пра гісторыю, гістарычныя выпрабаваньні, актыўнасьць беларусаў Беласточчыны, пра што ўжо казалі ў “Сваім Ладзе”. Хачу засярodзіцца толькі на тым, што сёньня значыць быць беларусам, якія з гэтым зьвязаныя выклікі.

Для мяне адчуваецца духоўная повязь з тым, што адбываецца на нашай вялікай Бацькаўшчыне Беларусі. І повязь вельмі моцная. Гэта цяжка зразумець, але тыя людзі, што жывуць па-за межамі Беларусі, уважлівей і часам эмацыйней рэагуюць на тое, што адбываецца ў мэтраполіі. Для нас - гэта павага да мовы, гісторыі, дзяржаўнасьці, тое, чым можна ганарыцца перад людзьмі іншае нацыі.

Я працаваў шмат гадоў настаўнікам гісторыі ў Гайнаўцы, дзе навучаюцца беларускай мовы. І пра тоеснасьць я казаў, каб вучні, моладзь гаварылі паміж сабой па-беларуску. На гэта часта адказвалі: “Пан прафэсар, мы будзем гаварыць, калі ў Беларусі будуць гаварыць па-беларуску. Бо там па–беларуску амаль што ніхто ня гутарыць. Што можна тут сказаць, калі гэта праўда. Я ня мог вытлумачыць прычыны такой зьявы. Але я ведаў, што мова жыве, людзі яе ведаюць. Што важна для нашае меншасьці? Паводле апошняга перапісу ў Польшчы, сваю прыналежнасьць да беларускай нацыянальнасьці дэклявала амаль што 50 тыс. жыхароў. Гэта паказвае вялікую сьведамасьць і адказнасьць. Беларусы на Беласточчыне могуць браць удзел у грамадзкім жыцьці краіны на роўнях кіраваньня, адукацыі, асьветы, палітыкі. Вельмі важны фактар і тое, што беларуская меншасьць у Польшчы зьяднаная тэрытарыяльна, што дазваляе самарэалізавацца.

***- Як удаецца захоўваць нацыянальную адметнасьць?***

З 1989 году, калі адбыліся перамены, мы, як беларуская інтэлігенцыя, сталі перад пытаньнем “Што рабіць?” Мы паставілі лёзунг: “Пра свае справы будзем гаварыць самыя!”. Беларуская эліта як адна зь меншасьцяў Польшчы, у 80-ыя стварыла сваю сыстэмную антыкамуністычную структуру. Гэта дало пачатак арганізаванага беларускага руху. Пасьля гадоў заняпаду, калі гаварылася, што Польшча – краіна аднанацыянальная, мы мусілі хутчэй адраджаць занядбанае. Гэты працэс трывае і па-сёньня. Ідзе ён зь пераменлівым посьпехам. У 90-ым у Польшчы, адбыліся першыя дэмакратычныя выбары і дзяржава вялікую частку сваіх паўнамоцтваў на роўні самакіраваньня перадала простым жыхарам. Цяпер значная наша ўвага зьвяртаецца на тое, каб жыхары выяўлялі актыўнасьць у самакіраваньні. Летась як вынік пэўнага працэсу паўстаў Беларускі самаўрадавы форум: нашыя бурмістры, войты, радныя, тыя, хто балятаваўся, стварылі арганізацыю для самаадукацыі і культуральнага разьвіцьця мясцовасьці. Бо асьвета, культура, школьніцтва – гэта кампэтэнцыі самакіраваньня. Другі важны кірунак – інфармацыйная прастора. Беларускі зьвяз выступіў зь ініцыятывай пашырэньня беларускіх перадачаў на “Радыё Беласток”, зьяўленьня праграмаў па-беларуску на Беластоцкай тэлевізіі.



Зь біяграфіі

Нарадзіўся ў 1965 годзе ў вёсцы Доўгі Брод, што ў гміне Дубічы Царкоўныя Гайнаўскага павету. У 1984 скончыў беларускі ліцэй у Гайнаўцы, пазьней вучыўся ў Варшаўскім унівэрсытэце на гісторыка. У 1980-ыя – лідар незалежнага моладзевага беларускага руху на Беласточчыне, працяглы час старшыня Беларускага Аб’яднаньня Студэнтаў, сябра Беларускага Гістарычнага Таварыства, сузаснавальнік і шэф-рэдактар беларускага Радыё Рацыя. З 1995 г. старшыня Беларускага саюзу ў Польшчы. Праваслаўны, жанаты, мае дачку.

Ад нас будзе залежаць, ці здолеем давесьці гэтую патрэбу. Трэба зьберці 30-50 тыс. подпісаў жыхароў Беласточчыны, якія б гэта падтрымалі. Яшчэ адна праблема – ўменьне ладзіць грамадзянскія акцыі, што ёсьць важным фактарам у разьвязаньні нашых спраў, мусім гэтаму вучыцца, як і ўсе грамадзяне Польшчы. Каб нечага дасягнуць, трэба ісьці разам з грамадзкімі патрабаваньнямі. Няўрадавыя арганізацыі павінны дапаўняць пэўныя формы працы дзяржавы. Дзяржава, сваім парадкам, мусіць забясьпечыць пэўныя рэчы. На жаль, дагэтуль у Польшчы яшчэ не прынялі закону аб нацыянальных меншасьцях. Яны прызнаныя канстытуцыяй, але з практыкі вынікаюць патрэбы канкрэтнага месца, у якім былі б свае акрэсьленыя правы. Таму нам патрэбны такі закон.

***- Як выглядае сытуацыя ў нашай краіне вачыма беластоцкага беларуса?***

Беласточчына на сумежжы, дзе шмат сяброўскіх, сямейных кантактаў. Але цікава, што беларусы ў Польшчы часам забываюцца ў якіх умовах яны яшчэ зусім нядаўна жылі і шмат на што глядзяць вачыма сёньняшняга дня. Прыкладам, моладзь праз эканамічную сытуацыю ў Беларусі ня хоча ідэнтыфікавацца з сваёю духоваю Бацькаўшчынай. Гэта вялікая праблема. Для нас, беларусаў замежжа, важныя каштоўнасьці беларускай незалежнай дзяржавы з нашаю адвечнай сымболікай. Толькі гэта можа даць трывалае месца ў Эўропе. Хочацца іх ня страціць, а ўмацаваць.

Зразумела, калі ня будзе моцнай духовай Бацькаўшчыны, нацыянальныя меншасьці і дыяспара выракаваныя на асыміляцыю. Мы адчуваем такую пагрозу. У Беларусі, на жаль, дамінуе расейская мова. Чужыя ж мова і культура вядуць у нябыт. Нам, па розныя бакі мяжы, трэба разьлічваць перадусім на свае сілы і працу. Мой дзядуля, які нікуды ніколі не выяджаў з свае вёскі, але меў за жыцьцё пашпарты шасьці ці сямі розных дзяржаў, ня раз паўтараў: “Спадзяваўся дзед на мёд, то лёг спаць ня еўшы”.

(заканчэньне на с.16)

# Існы характар улады ня тое, што яна паказвае, а тое што яна хавае

*Як толькі ні зьясьняецца панята кдэмакратыі ў некаторых усходнеэўрапейскіх краінах! Што да Беларусі, дык тут “славянскія тэарэтыкі“ досыць пасьпелі ўнесьці ў яго новага, асабліва ў гвалтаваньні незалежнасьці краіны. А тым часам за доўгімі размовамі пра дэмакратыю, маскуецца палітычная ўбогасьць ды замутняецца існасьць дэмакратычнага ладу жыцьця: вызваленьне натуры чалавека. Так, толькі свабода дазваляе чалавеку спраўджваць здольнасьці ды мары на карысьць і сабе і грамадзтву, забыўшыся на цэнзуру, прымус, перасьлед за іншадумства. А апошняе наш рэжым ахвотна практыкуе. І толькі ў умовах запраўднае дэмакратыі можна дабіцца посьпехаў ў эканоміцы. Але стан нашай эканомікі гаворыць пакуль што аб прынцыповай нястачы дэмакратыі.*

Адна з падстаў дэмакратычнага грамадзтва – мясцовае самакіраваньне. Гэта спосаб выкарыстаньня энэргіі свабодных людзей на разьвязваньне сваіх мясцовых праблем. Але і да мясцовага самакіраваньня ў нашых уладаў свой “геніяльны падыход”, хіба што Эўрапейская хартыя Мясцовага Самакіраваньня поўніцца недапрацоўкамі. Адумыснае разуменьне мясцовага самакіраваньня - гэта адзін з элемэнтаў асаблівага шляху Беларусі да “квітненьня”. Праўда, чамусьці гэты шлях большнапамінае рух да зьнікненьня. Хто ведае, можа тут істотнае квітненьне асобае купкі грамадзян?

Быў час калі камуністы ў савецкай імпэрыі марылі пра шырокі ўдзел народу ў кіраваньні дзяржаваю. Прыпічыліся, просты народ ня мае амбітных памкненьняў да кіраваньня, яго куды больш турбуюць мясцовыя праблемы, якія ў імпэрыі разьвязваліся не найлепшым спосабам. У сучаснай Беларусі яшчэ захоўваецца настальгія па былой калёніі імпэрыі, увасобленая бальванамі на плошчах ціня кожнага гораду. І ўлада па-ранейшаму штучна абмяжоўвае шырокі ўдзел грамадзян нават у мясцовых справах.

Чаму ў сёж учорашнія сяляне, стаўшы да стырна, так абцяжваюць сябе ўмяшаньнем у мясцовыя справы, зусім не даваяраючы простым грамадзянам, якіх лёс не абдарыў уладаю, хоць такі стан рэчаў выклікае адно ўзаемны недавер і злосьць? Ясная рэч, няма нават каліва дэмакратыі: ані роўнага фармаваньня выбарчых камісіяў, ані свабоднага вылучэньня кандыдатаў, ані празрыстых выбараў ды падліку галасоў. Забясьпечыць уладу дзеля бязьбеднага існаваньня невялікае групы людзей - вось прычына тутэйшае мадэлі мясцовага кіраваньня і самакіраваньня. Шкада, але нашая нясьведамая, досыць прымітыўная палітычная і сацыяльная атмасфэра спрычынілася да сучаснага стану рэчаў у мясцовым кіраваньні.



Вось сымбаль твой?

Адна рэч тэарэтызаваць звонку і зусім іншая - абірацца дэпутатам мясцовага Савету ды назіраць сыстэму зь сярэдзіны. Сыстэма мясцовага кіраваньня і самакіраваньня працуе на даволі простай і нетрывалай умове – “кадравым” падборы дэпутатаў. “Кадравы” дэпутат не павінен заглыбляцца ў дамэтнасьць спалучэньня кіраваньня і самакіраваньня, аб'ектыўна глядзець на рэчы, вывучаць цьвілізаваны досьвед і г.д., а павінен гаварыць толькі тое, што дазволена, быць асабіста забясьпечаным, што ёсьць падставаю эгаізму, і з гэтае нагоды адчуваць неадменны страх.

Хто плаціць той і музыку заказвае! Ня выбарны, не прадстаўнічы ад грамадзтва выканкам кантралюе фінансы і мае перавагу супраць выбарнага, прадстаўнічага Савету дэпутатаў. А сам Савет насу пераку сякай лёгіцы робіцца фармальным органам. Гэта значыць - калёсы стаўяцца паперад каня, ды яшчэ каня саламянага. Выходзіць, грамадзкасьць у нас не галоўнае, Савет дэпутатаў усяго толькі дэмакратычная шырма для палітычнае і эканамічнае самаволі з убогім правам, журналістамі ў турмах, зь пісьменьнікамі ў выгнаньні і г.д. Сыстэма кіраваньня і самакіраваньня пачынае выяўляць сваю недасканаласьць, калі хоць адзін дэпутат пачне дэманстраваць свабоду свае натуры.

Хоць я і пасьпеў папрацаваць ў умовах камуністычна-савецкага ладу, але нязручна пачуваўся ўжо на другой сэсіі Берастаўіцкага савету дэпутатаў які, як машына часу, перанёс нас у камуністычнае мінулае. А можа маюць рацыю нашыя дэпутаты? Навошта фармальна напружвацца пры такіх правох Савету? Навошта абмяркоўваць нейкі там рэгламант, калі з такімі магчымасьцямі ніхто і ня зглядзіць таго рэгламанту? Праўда, гэта ўжо будзе абыякавасьцю далёсу Бацькаўшчыны. Гэткія жыцьцёвыя ўстаноўкі дэпутатаў, узору савецкага чалавека, ніколі не дадуць нам падняцца на ногі. Што ж, над намі пануюць тыя хто нічога ня помніць! З усяго тут сказанага можна зрабіць адну выснову: дзяржава ўзяла курс на ўціск асобы. Але няма будучыні ў рэжыму, які існуе толькі дзеля сябе самога!

**Алег Рамашкевіч**
**Дэпутат Берастаўіцкага раённага Савету дэпутатаў**

# Цэны на нерухомасьць як адлюстраваньне беларускіх эканамічных тэндэнцыяў

За апошнія два з паловаю гады, дакладней з пачатку Х1с., сярэднестатыстычнаму беларусу зрэалізаваць канстытуцыйнае права на жытло і на вартыровень жыцьця стала яшчэ цяжэй: рэальна налічаная заробная плата ( "звыклая" запазьненасьць у выплатах – 2 і болей мільярдаў беларускіх рублёў) за гэты час узрасла на 14 %, а цэны на нерухомасьць узрасьлі на 40% ў сярэднім па Рэспубліцы, і на 35.5 % ў Гародні.

Падарожаньне закранула ўсе сэгмэнты рынку Гарадзенскае нерухомасьці: катэджы, новыя кватэры, другаснае жытло і г.д. Галоўная будаўнічая "жытловая" кампанія ААА "Гароднажылбуд" падняло цану аднаго квадратовага мэтру сф160$ ЗША да 220-240, катэджы ў горадзе падаражалі на 30%, крыху менш - за горадам.

Найболей падарожалі аднапакаёвыя кватэры другаснага рынку жытла – амаль што на 40%. Нашмат менш – двух і трохпакаёвыя, амаль што на 30% — чатырохпакаёвыя кватэры (глядзі табліцу).

Які раней, цана кватэры залежыць ад плянаваньня, мэтравасьці і паверху, месца, тыпу дому, "мажлівага" эўрарэмонту і шэрагу іншых чыньнікаў.

На цяпер сярэдняя цана кватэры ў Гародні, ня першы і не апошні паверх, у нармальным стане, новага плянаваньня, складае:

аднапакаёвая – 10300$;
двухпакаёвая – 13400$;
трохпакаёвая – 16200$;
чатырохпакаёвая – 19100$.

Гэта сярэднія цэны на стандартныя кватэры новага плянаваньня. Кватэры зь вялікімі кухнямі, палепшанам (пашыраным) плаянаваньнем каштуюць, як відаць з табліцы, даражэй за кватэры другаснага рынку жытла ў Гародні. Аднолькава дарагія кватэры з добрым аффэўрапейскім рамонтам, які моцна падарожаў за апошнія гады.

Па-ранейшаму ня маюць попыту кватэры на першым і апошнім паверхах, хоць прадаўцы просяць падвышаныя сумы. Гэтаксама цяжка прадаць чатырохпакаёвыя кватэры палепшанага плянаваньня, што ня ў цэнтры гораду.

Карыстаюцца попытам аднапакаёвыя кватэры новага плянаваньня, кватэры пры аўта- і чыгуначных вакзалах, цэнтральнае часткі Гародні.

Якія ж пэрспэктывы на рынку нерухомасьці Гародні і ў цэлым па краіне?

Мяркуецца, што жытло будзе дарожаць яшчэ хутчэй. Сёньня цана на нерухомасьць у Беларусі куды ніжэйшая як у нашых суседзяў. Найперш - у Расеі, у грамадзян, якія маюць роўныя жытловыя правы (і ня толькі, згодна зь міжнароднаю дамоваю) з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Большая частка грамадзянскай нерухомасьці Растову, Валгараду, Самары і іншых буйных гарадоў Расеі ўжо зараз куды даражэйшая за такія самыя аб'екты нерухомасьці сталічнага гораду Менску...

Пэўна што сёньняшнія цэны кватэр у Гародні складаюць толькі каля 58% ад цэнаў такіх самых кватэр Менску і павінны ўзьняцца да паказьніка 75% ад сталіцы. Гароднія ў сёжу кантэксьце жытловага будаваньня разьвіваецца дынамічней, хоць і ненашмат. Ды й гораду нас памежны: побач Літва, Польшча…Эўразьвяз...

Было б непажадана далейшае падарожаньне беларускай нерухомасьці зьвязваць толькі з расейскім фактарам. Ёсьць і іншыя чыньнікі, прыкладам, падарожаньне будаўнічых работ. Пры выкананьні бюджэту ўзрасьце і рэальная заробная плата (праўда, толькі на 6-7%). І, сваім парадкам, адбудзецца далейшы, хоць і нязначны, ціск на цэны нерухомасьці. Але гэта ўжо сусьветныя эканамічныя законы і тэндэнцыі, якія не заўжды адпавядаюць Беларусі. Асабліва пры заробках, у сярэднім крыху больш за 100$. Але сачыцьмем за сытуацыяй.

***Сяргей Міронаў***

| Колькасьць пакояў | Месца | Плян-не | Тып дому | Паверх | Цана ў $ на 4.07.03 (просяць) | Цана ў $ на 01.01. 2001( прыблізна) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Вул. Урублеўскага | хрушч. | панэл. | 2/5 | 8500 | 6500 |
| 1 | Вул. Паповіча | хрушч. | панэл. | 1/5 | 8000 | 6000 |
| 1 | Вул. Дамброўскага | хрушч. | панэл. | 5/5 | 8200 | 6000 |
| 1 | Вул. Урублеўскага | брэжн. | панэл. | 4/5 | 9500 | 7000 |
| 1 | Вул. Каліноўскага | брэжн. | панэл. | 4/5 | 9000 | 7000 |
| 1 | Вул. Ліможа | нов. | цэгл. | 2/9 | 10200 | 7900 |
| 1 | М-н. Фолюш | нов. | панэл. | 1/9 | 9500 | 7500 |
| 1 | Вул. Таўлая | нов. | панэл. | 2/9 | 10500 | 7900 |
| 1 | Вул. Кляновая | нов. | цэгл. | 2/10 | 11000 | -- |
| 2 | Пр-т. Касманаўтаў | хрушч. | панэл. | 1/5 | 10000 | -- |
| 2 | Вул. Дамброўскага | хрушч. | панэл. | 4/5 | 9900 | 7500 |
| 2 | Вул. В.Соламавай | хрушч. | панэл. | 3/5 | 10000 | -- |
| 2 | Вул. Церашковай | чэская. | панэл. | 8/9 | 12900 | 9500 |
| 2 | Вул. Фамічова | чэская. | панэл. | 5/5 | 12500 | 9500 |
| 2 | Вул. Л.Чайкінай | чэская. | панэл. | 4/9 | 13500 | -- |
| 2 | Вул. Дзяржынскага | нов. | цэгл. | 3/12 | 13000 | 10000 |
| 2 | Вул. Шчорса | нов. | панэл. | 3/9 | 14000 | 10000 |
| 2 | Вул. Курчатава | нов. | цэгл. | 4/9 | 13800 | -- |
| 3 | Вул. Паповіча | хрушч. | панэл. | 1/5 | 12900 | -- |
| 3 | М-н. Фолюш | хрушч. | панэл. | 2/5 | 12500 | -- |
| 3 | Вул. Урублеўскага | брэжн. | панэл. | 2/5 | 13000 | 9500 |
| 3 | Вул. Брыкеля | нов. | цэгл. | 7/9 | 16500 | -- |
| 3 | Пр-т. Кляцкова | нов. | панэл. | 5/9 | 15900 | 11500 |
| 3 | Вул. Сацыялістычная | сталінск | цэгл. | 2/3 | 26000 | -- |
| 3 | Вул. Кабяка | нов. | панэл. | 8/10 | 16500 | 11500 |
| 3 | Вул. Шчорса | нов. | панэл. | 5/9 | 18000 | 13000 |
| 3 | Вул. Дзяржынскага | нов. | цэгл. | 4/12 | 18000 | 12000 |
| 3 | Вул. Гая | чэская. | панэл. | 3/5 | 17000 | 13000 |
| 3 | Пр-т. Я. Купалы | чэская. | панэл. | 6/9 | 16500 | 13000 |
| 4 | Вул. Суворава | хрушч. | панэл. | 4/5 | 13800 | -- |
| 4 | БЛК | чэская. | панэл. | 3/9 | 22000 | -- |
| 4 | Вул. Паповіча | чэская. | панэл. | 3/9 | 21000 | 16000 |
| 4 | Вул. Курчатава | нов. | цэгл. | 4/9 | 19500 | -- |
| 4 | Пр-т. Кляцкова | нов. | панэл. | 2/9 | 18800 | 14000 |
| 4 | Вул. Горкага | нов. | панэл. | 3/9 | 24500 | -- |
| 4 | Вул. Сав.Памежнікаў | нов. | панэл. | 7/11 | 22000 | 20000 |

# Як бы зямля ні прамерзла!



*27 – ліпеня – Дзень абвяшчэньня дэкляраціі аб сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусь. Лепшыя сыны і дочкі беларускага народу, пасьля заняцьця нашай зямлі Расеяй, стагоддзямі выношвалі ідэі незалежнасьці і змагаліся за іх. Галоўным дасягненьнем у гэтым змаганьні стала аднаўленьне беларускае дзяржаўнасьці 25 сакавіка 1918 году. Заснавальнікі Беларускай Народнай Рэспублікі, калі абвяшчалі Акт утварэньня БНР, пэўна марылі, што ўжо першыя ўгодкі адраджэньня сваёй дзяржаўнасьці беларусы будуць адзначаць у вольнай дэмакратычнай краіне. Аднак гэтага не адбылося ні праз год, ні праз два, ні праз 85 гадоў. Чаму так сталася, тэма для асобнай гаворкі.*

Цяперашняя ідэолягі,ніяк ня могуць прыдумаць для насельніцтва агульнае ідэі, якая б стала падмуркам для шырокамаштабнага «навуковага» псыхалягічнага апрацоўваньня людзей, што жывуць у Беларусі. Гэта дазволіла б зноў пасадзіць на шыю падаткаваньнікаў плойму палітработнікаў, ці нават арганізаваць ідэалягічныя абкамы, гаркамы і г.д. Потым галоўны палітрук змог бы прызначыць сябе пажыцьцёвым генсэкам над усімі «амамі» і можна хоць штогод праводзіць выбары новага прэзыдэнта, накшталт “всесоюзного старосты” Калініна пры Сталіне. Але нічога неатрымоўваецца. Спрабуюць зьмяшаць ў адным катле: «любасьць і адданасьць» да «ўсенароднаабранага», хлусьню пра мінуласьць беларусаў, настальгію па Савецкім Саюзе, блеф пра вылучнасьць беларускага народу, які ідзе да «сьветлай будучыні» сваім, адрозным ад суседзяў, шляхам. Гэты кактэйль замоцна сьмярдзіць і нікому не даспадобы. Самае сьмешнае, што былыя выхаванцы КПСС хочуць назваць сваё вынаходніцтва «нацыянальнай ідэяй», маўляў, у беларусаў пакуль што такой няма і таму яе тэрміновa трэба стварыць.

Але насельніцтва нейкай тэрыторыі можна назваць народам толькі тады, калі яго яднаюць агульная ідэя, нацыянальная мова і сымболіка. Выходзіць,людзі, што ўладараць зараз у Беларусі,ня лічаць нас народам. Нацыянальнай ідэі няма - яны яшчэ яе выдумваюць. Сымболіку выдумалі колькі гадоў таму. Мова быццам бы ёсьць, але нейкая недарэчная, фальклёрна-музэйны экспанат, ня больш. Аднак самыя беларусы даводзяць адваротнае. Нашыя нацыянальныя сымбалі яднаюць народ з часоў сівой даўніны. Акупанты іх забаранялі рознымі мэтадамі ад паклёпаў да растрэлаў. Але нічога не атрымалася. Зараз Пагоня і Бел-Чырвона-Белы сьцяг зноў пад забаронаю. Сем гадоў розныя цэрбэры намагаюцца адвучыць людзей ад сваіх Сьцягу і Гербу. Штрафуюць за іх выкарыстаньне на мітынгах, міліцыянты на спартовых мерапрыемствах замест таго, каб сачыць за парадкам, віжуюцьза заўзятарамі - ня дай Бог узьняць тым беларускі нацыянальны сьцяг на чэсьць перамогі нашых спартоўцаў. Але высмаліць з памяці народу яго сымбалі нельга. Больш таго, для ўсяго сьвету яны зрабіліся ня толькі знакам нацыянальнай прыналежнасьці беларусаў, але і змаганьня за незалежнасьцьі дэмакратыю.

Ў адной з тэлепраграмаў розныя экспэрты ламалі галовы над дзіўным фэномэнам. Беларускае мовы амаль што не чуваць на вуліцах, беларускія школы і клясы зьнікаюць, як пасьля патопу, але згодна з апошнім перапісам большасьць жыхароў краіны назвалі гэтую мову роднаю, а каля паловы сьцьвердзілі, што карыстаюцца ёй у побыце. На маю думку, усё тлумачыцца вельмі проста. Нашыя людзі, дзякуючы генэтычнай памяці, ведаюць пра варожасьць чужынскіх уладаў у былыя часы да беларускай мовы і пра небясьпеку адкрытага карыстаньня ёй. Зараз юрыдычна мова не забароненая, але фактычна - так. Чалавек, што гаворыць па-свойму адразу выклікае падазронасьць у чыноўнікаў і «праваахоўных» органаў у нелаяльнасьці да існай улады. Паўсюль карыстацца роднай мовай – гэта значыць штохвіліннае змаганьне. На такое здольныя толькі адзінкі. Аднак народ падсьведама разумее ненармальнасьць такой сытуацыі. Вынікі перапісу паказваюць, што беларусы – народ, які паважае сябе. А яго мова стала ня толькі сродкам зносінаў, але і сымбалем змаганьня за незалежнасьцьі дэмакратыю.

Ідэалы незалежнасьці і дэмакратыі ёсьць падмуркам нацыянальнай ідэі ўсіх цэнтральнаэўрапейскіх народаў (менавіта гэтым мы розьнімся ад расейцаў, у якіх замест дэмакратыі імпэрскасьць). Яна кшталтавалася ўіх праз цэлыя стагоддзі. У нашых суседзяў гэтыя ідэалы ўжыцьцявіліся. Палякі і летувісы тыя дні, калі спрадвечныя мары іх дзядоў зьдзейсьніліся, адзначаюцьяк дзяржаўныя сьвяты. Гэтым народам ужо ня трэба змагацца за ўжыцьцяўленьне асновы сваіх нацыянальных ідэяў. Зараз для іх на першым пляне стаяць эканоміка сваіх краінаў, пытаньне ўходжаньня ў НАТА і Эўразьвяз. Яны могуць дазволіць сабе міжпартыйныя спрэчкі. У час выбараў грамадзяне аддаюць перавагу тым ці іншым палітыкам, а могуць наагул не зьвяртаць на іх увагі. Але ні ў воднай краіне ня можа быць палітычнае сілы, якая выступае супраць незалежнасьці і дэмакратыі, ганьбіць нацыянальныя сымбалі. Тым больш нельга ўявіць, што гэта можа быць дзяржаўнай палітыкай.

На жаль, у Беларусі пакуль што ўсё наадварот. Ідэалы БНР застаюцца толькі марай. Таму няма ў нас свайго гледзішча на пабудову эканомікі. Сьвяткаваньне запраўднай незалежнасьці, прыкладам, Дзень Волі, а значыць, і сама Воля пад забаронаю. Здаецца, пры такім становішчы ўсе людзі, якія хочуць палепшыць сваё жыцьцё, і жыцьцё сваіх нашчадкаў, павінны згуртавацца пад сьцягам нацыянальных ідэалаў. Замацаваць падмурак нармальнай дзяржавы. Але такога не назіраецца. Апазыцыя стракацейшая за вясёлку. Палітычныя лідары апошніх часоў больш ангажуюцца ў змаганьні паміж сабою, чым у справе перамогі незалежнасьці і дэмакратыі. Народ глядзіць на гэта і пляваць хоча, як на ўладу, так і на апазыцыю.

Гэтая сумная зьява мае свае прычыны. Было б наіўна лічыць, што шматгадовыя намаганьні ворагаў Беларушчыны ня мелі плёну. Вырасла некалькі пакаленьняў без гістарычнай памяці. На шчасьце ў пераважнай часткі дрэмле генэтычная памяць. Але чалавек не жывёла. Ён ня можа жыць толькі інстынктамі. Нехта шукае вылучна асабістае выгады, служыць той уладзе, якая існуе на даны момант (пасьля спакойна можа яе зганьбіць і служыць іншай). Нехта не зьвяртае ні на што ўвагі, жыве як жывецца. Іншых да ўлады не дапусьцілі, або адхілілі ад яе і яны зрабіліся «апазыцыяй», але для такіх на першым пляне таксама свае інтарэсы. Некаму хочацца нешта зьмяніць, аднак іх не «адпускае» савецкая школа. Частка апошніх лічаць сябе апазыцыянэрамі, кажуць пра нацыянальнае адраджэньне, але для іх гэта пытаньне другаснае, недзе нават непатрэбнае, даніна калегам з апазыцыйнага блёку, якіх яны міжсобку называюць «нацыяналістамі». Але чалавека, для якога нацыянальныя ідэалы ёсьць сьвятыняй, не спакусіш абяцанкамі пра танную каўбасу і не запалохаеш міліцэйскай дубінкай. І пакуль лідары апазыцыі ад неведаньня што рабіць, высьвятляюць міжсобку дачыненьні - толькі аддана сьць людзей ідэалам незалежнасьці і дэмакратыі можа выратаваць становішча.

Пасьля зімы заўсёды прыходзіць вясна. Як бы ні прамерзла зямля...

***Зьміцер Кісель***

# Дзейнасьць вартая пераймарньня

*Увесну 2002 году Гарадзенскі гарвыканкам зарэгістраваў гарадзкое аддзяленьне Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Таварыства беларускае школы" (ТБШ). Нават дасьведчаныя людзі часам блытаюць гэтую арганізацыю з грамадзкім аб'яднаньнем "ТБМ імя Ф.Скарыны". Тым часам, ТБШ шырока слыло ў Заходняй Беларусі, мела разгалінаваную сетку гурткоў, соткі сяброў. Думаецца, што гэтая інфармацыя зацікавіць чытачоў бюлетэню "СЛ".*



У бібліятэцы ТБШ

Культурна-асьветная арганізацыя ТБШ чынна працавала ў Заходняй Беларусі ў 1921–1936 гады. Першы Статут зацьвердзілі 1-га сьнежня 1921 году. Само Таварыства запачаткавалі ў мястэчку Радашкоавічы. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў – ведамы Браніслаў Тарашкевіч. Ён ставіў сабе за мэту шыраньне беларускай асьветы, спрыяньне беларускім школам, падвышэньне агульнаадукацыйнага і культурнага роўню насельніцтва, яго нацыянальнае сьведамасьці, праціўленьне гвалтоўнай палянізацыі.

У розныя часы ў кіраўніцтве ТБШ былі Р.Астроўскі, Я.Гаўрылік, М.Гарэцкі, І.Дварчанін, П.Кізевіч, П.Крынчык, А.Луцкевіч, М.Марцінчык, П.Мятла, С.Паўловіч, М.Пяткевіч, С.Рак-Міхайлоўскі, А.Станкевіч, Ф.Стацкевіч, А.Уласаў Я.Шнаркевіч. Таварыства стаяла па-за палітычнымі партыямі. Складкі зьбіраліся ў памеры 1,5% ад заробку.

Паводле дапоўненага Статуту ад 1926 году найвышэйшым органам прызнаваўся зьезд, а паміж зьездамі – Галоўная Ўправа разам з Нагляднай Радай. У канцы 1927 г. ў Заходняй Беларусі было 12 акруговых Управ ТБШ, у тым ліку – у Гародні (336 сяброў, 17 гурткоў), Лідзе (435\25), Міры, Навагрудку (1.884\49), Сьвіслачы, Ваўкавыску (246\9), Слоніме (870\25). Усяго налічвалася 10.458 сяброў, згуртаваных у 385 гуртков. Працавала за 250 бібліятэк-чытальняў, 100 народных Дамоў. Разам з спрыяльнікамі колькасна арганізацыя дасягала амаль 20 тысяч.

У 1921-1937 г. ТБШ чынна дзеіла ў рабоце культурна-асьветных арганізацыяў Гародні. У 1937/38 гадох на ўтрыманьне школьных бібліятэк Гародні дзяржаваю распусьцілі толькі 140 злотых 46 грошаў (на заплату гарадзкому старосьце выдаткавалі 8.477 злотых, ці ў 60 разоў болей).

У кнізе "Памяць: Гродна" ёсьць здымкі Гарадзенскай акруговае ўправы ТБШ, асобы: Е.Паддубіцкі, І.М.Баліцкі (старшыня), Кулакоўскі, З.Кулакоўскі, Н.К.Ламанцэвіч, П.Ф.Кізевіч, В.Варанюк.

Другі фотаздымак мае подпіс: "Зьезд ТБШ у Гародні, 1926 г.".

Адкрыцьцё беларускіх школ ніколіня сходзіла з парадку дня дзейнасьці ТБШ. Таварыства дапамагала матар*яльна і мэтадычна Віленскай, Радашкоавіцкай, Клецкай, Навагрудзкай гімназіям. ТБШ рыхтавала падручнікі, займалася кнігавыданьнем: у 1921 годзе ў Вільні заклалі Выдавецтва ТБШ. 11-14 красавіка 1923 году ў Вільні адбыўся зьезд пэдагогаў беларускіх гімназіяў. Баранілі нацыянальныя правы на парляманцкім роўні, зьяднаўшыся ў адзіным Беларускім пасольскім (дэпутацкім) клюбе ў польскім парляманце.

З 1926 году ТБШ змагла працаваць легальна па ўсёй Заходняй Беларусі — у Віленскім, Навагрудзкім, Палескім і Беластоцкім ваяводзтвах. Адразу зьберлі 16 тысяч дэкляраацыяў з патрабаваньнем адкрыцьця за 400 беларускіх школ.

Адкрыць беларускую школу было вельмі цяжка: бракавала сродкаў, дрэнна ставіліся ўлады. Аднак у 1927/28 навучальным годзе толькі ў Віленскім і Палескім школьных акругах адчынілі 19 беларускіх урадавых школ. Зь іх – 11 – у былым Віленскім павеце. У польска-беларускіх школах найболей працавалі польскія настаўнікі.

У ліпені 1927 году адкрыліся 134 бібліятэкі-чытальні і 41 народны Дом. Беларускія настаўнікі шукалі грошай на падпіску газэту сваякоў, у родных у Амэрыцы. Каб зьбіраць грошы на месцы, трэба было атрымаць дазвол старосты, гэтак і на настаўніцкія спэктаклі. Тэкст абавязкова даваўся на прагляд прадстаўніку ўлады.

У Гарадзенскім павеце вылучаліся актыўнасьцю Пётра Саўчук, Ёсіф Клімовіч, Дзмітры Кулікоўскі, Філіп Кізевіч, Лізавета Паддубік, Пётра Мышко, Н.Ламановіч. У Навагрудзкім – Апанас Аляшкевіч, Пётра Грыц, Сямён Навагран, Антон Малец.

У 1928 годзе ў Гародні працавалі акруговы камітэт і гарадзкое аддзяленьне ТБШ. 2 ліпеня 1929 году дзейнасьць гэтых грамадзкіх структур забаранілі.

Першы зьезд ТБШ адбыўся ў Вільні 28-29 сьнежня 1927 году. Дэлегаты патрабавалі адкрыцьця дзяржаўных беларускіх школ, гімназіяў і настаўніцкіх курсаў, сэмінарыяў. Да сярэдзіны 1928 году колькасьць гурткоў дасягнула 430 (14-15 тысяч чалавек). У сярэдзіне 1930 году было ўжо 500 гурткоў – 30 тысяч асобаў.

ТБШ выкрывала антыбеларускую дзейнасьць сыстэмы асьветы, школьнага заканадаўства Польшчы. Арганізавалі прыняцьце заяў бацькоў аб адкрыцьці беларускіх школ (1924\1925 г. – 16 тысяч заяў на 442 школы, да 1928 г. – больш за 30 тысяч заяў на 1.229 школ).

У 1927\1928 навучальным годзе адкрылі 78 уласна беларускіх і польска-беларускіх школ. Працавалі пункты самаадукацыі, народныя Дамы, харавыя калектывы, настаўніцкія курсы ў Радашкавічах. Выдаваўся папулярны "Беларускі каляндар". Свае брашуры надрукавалі І.Дварчанін, А.Паўловіч.

Кампартыя Заходняе Беларусі ўсяляк імкнулася ўплываць на ТБШ, палітызаваць яе работу. Нацыянальна-дэмакратычная інтэлігенцыя выступала за пашырэньне асьветнае дзейнасьці. Прыхільнікі палітызацыі перамаглі. Зьезд у Вільні (19.05.1929) з ТБШ выдаліў Р.Астроўскага, А.Луцкевіча, Я. Шнаркевіча, Каўша. Да восені 1932 г. колькасьць гурткоў паменшылася да 150 (чатыры тысячы чалавек).

Лявацка-сэктанцкая палітыка КПЗБ нарабіла толькі шкоды. Закрыліся беларускія школы ў Радашкавічах (1929), Клецку (1931), Навагрудку (1934). У 1928 годзе забаранілі дзейнасьць шасьці (6) управ і 300 гурткоў 1-4 лютага 1933 году ў Вільні адбыўся суд над сябрамі Галоўнай управы ТБШ за "камуністычную змову". Стацкевіча, Шырму, Пяткевіча апраўдалі. Максім Скурко (Танк) атрымаў два гады турмы.

Пазьней у БССР актывістаў ТБШ рэпрэсавалі: Рак-Міхайлоўскага, Мятлу, Дварчаніна, Валынца, Гаўрыліка, Тарашкевіча. У Заходняй Беларусі працягваліся бесьпадстаўныя перасьледы з боку КПЗБ.

У 1932 г. ўзьнікла Таварыства беларускай асьветы.

Зьезд ТБШ 17 чэрвеня 1934 году заклікаў да большага імпэту. І адразу ўзмацніўся перасьлед з боку польскай адміністрацыі. Але ў студзені 1936 году чыннымі стараньнямі дабіліся 4,5 тысяч заяў грамадзян з патрабаваньнем адкрыцьця беларускіх школ, якія на той час амаль што зусім пазачынялі (у канцы 1936 году было 8 беларускіх і 14 польска-беларускіх пачатковых школ, а таксама гімназія ў Вільні). Шырылася самаадукацыя, хатняе навучаньне.

Да 15-годдзя ТБШ ў Вільні (13.12.1936 г.) праводзіўся Дзень беларускае культуры. Удзел бралі многія актывісты ТБШ.

ТБШ скасавалі польскія ўлады 2 сьнежня 1936 году. 4-га сьнежня забаранілі Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры. 2-га жніўня 1937 году – Зьвяз беларускіх настаўнікаў. 16-га красавіка 1938 году – Беларускі Гаспадарчы Зьвяз.

У розны час выдаваліся "Бюлетэнь ТБШ", часопіс "Весьнік ТБШ", газэта "Шлях". Прыкладам, "Беларускі каляндар на 1928 год" выдаваўся ў Вільні. У разьдзеле пра дзейнасьць Таварыства даводзіцца да ведамасьці, што ў 1919-1921 гадох толькі ў Віленскім ваяводзтве было за 200 беларускіх пачатковых школ. У 1927 годзе працавалі чатыры прыватныя гімназіі – Віленская, Радашкавіцкая, Навагрудзкая і Клецкая. У купе тут вывучыліся 387 чалавек.

**Падрыхтаваў Антон Лабовіч**

рэха

# Косьці разладу

**Прадстаўнікі габрэйскіх арганізацыяў назвалі рэканструкцыю стадыёну “Нёман” “найвялікшай зьнявагай габрэйскага народу”**

*Беспрэцэдэнтна жорсткую заяву што да рэканструкцыі гарадзенскага стадыёну “Нёман” зрабілі габрэйскія рэлігійныя лідары Вялікабрытаніі, якія на мінулым тыдні наведалі Гародню. Рабін Гершаль Гляк, прадстаўнік Камітэту захаваньня габрэйскіх могілак ў Эўропе, які асабіста наведаў стадыён заявіў, што ў Гародні адбылося спаганеньне тысячаў габрэйскіх магілаў. Ніякай рэакцыі з боку уладаў на гэтую заяву пакуль што няма. Працы на стадыёне “Нёман” працягваюцца.*



Сытуацыя вакол рэканструкцыі стадыёну “Нёман”, дзе, нагадаем, да 1960-х гадоў былі габрэйскія могілкі, ня першы раз прыцягвае ўвагу сусьветнае габрэйскае грамадзкасьці. Ужо месяц таму ўчас афіцыйнага візыту ў Гарадзенскую вобласьць Надзвычайнага і паўнамоцнага амбасадара Францыі Стафана Шмялеўскага, з просьбы французскіх габрэйскіх арганізацыяў гэтая тэма падымалася ім у размовах з старшынём Гарадзенскага аблвыканкаму Уладзімерам Саўчанкам. Але як паказала далейшае разьвіцьце падзей, ніякага ўплыву на працы рэканструкцыі стадыёну гэта не зрабіла. Адзінае на што пайшлі ўлады - гэта шуканьне кампрамісу з гарадзенскімі габрэйскімі арганізацыямі. Як раней шмат разоў дакляраваў старшыня габрэйскае грамады Гародні Міхаіл Корж, узаемаразуменьне паміж уладай і гарадзенскімі габрэямі ёсьць. Згодна з дамоўленасьцю працы працягваюцца, а знойдзеныя косьці пахаваюць ўадпаведнасьці з габрэйскімі звычаямі, акрамя таго, на стадыёне разьмесьцяць памятную табліцу. Але гэта не задавальняе замежныя габрэйскія арганізацыі і рэлігійных дзеячаў. Яны патрабуюць спыненьня шыраньня стадыёну, бо гэта вядзе да далейшае дэвастацыі могілак. Тое, што адбываецца на стадыёне “Нёман” на думку рабіна Гершаля Гляка - “найвялікшая зьнявага габрэйскага народу”. У сваёй заяве для прэсы ён кажа: “Усякі цывілізаваны чалавек здрыганўся б ад жаху, убачыўшы такі вандалізм і непавагу да чалавечых парэштк аў.”

“Я спатыкаўся з Глякам у час яго візыту ў Гародню. Ён глядзіць на сытуацыю вачыма рэлігійнага чалавека… Але заява - гэта адно, а рэальнае жыцьцё - іншае. Калі ўклалі вялікія грошы, і то не асабістыя грошы, дык хто ж затрымае працу? Наагул, падобныя заявы мала лучацца з рэчаіснасьцю. Калі ўлады выканаюць нашыя дамовы, дык, я лічу, канфліктная сытуацыя мінецца,” - кажа Міхаіл Корж. Спадар Корж таксама лічыць, што падобныя грамадзкія арганізацыі самыя зацікаўленыя ў разьдзмухваньні скандалу. “Яны дзякуючы такім скандалам больш грошай атрымаюць, можна заяўляць, што заўгодна, але тут не Нямеччына, дзе, калі пачалі будаваньне супэрмаркету на месцы габрэйскіх могілак, дык працу адразу спынілі, а фірма, якая набыла зямлю атрымала кампэнсацыю. У нас зусім іншая сытуацыя, акрамя таго тут ужо амаль што ўсё зроблена. Таму, калі ўлады выканаюць свае абяцаньні, дык будзе добра,” – кажа Міхаіл Корж.

Патрохус тановіцца традыцыяй, што паслы краінаў Эўразьвязу, якія наведваюць Гародню, на сустрэчах з кіраўніцтвам вобласьці абавязкова падымаюць пытаньне аб наступнасьцях рэканструкцыі стадыёну “Нёман”. Так у час нядаўняе сустрэчы з кіраўніцтвам Гарадзенскай вобласьці амбасадар Вялікабрытаніі Бранд Бэнэт узьняў праблему перазахаваньня чалавечых парэштк аў, якія знайшлі ў час рэканструкцыі стадыёну “Нёман”.

2 ліпеня на стадыёне адбылася першая футбольная гульня. Улады вельмі сьпяшаліся, каб урэшце-такі гэтая гульня адбылася. Паводле зьвестак зь інфармаваных крыніцаў яшчэ за 5 дзён да гульні на контстадыёну мелі свае заўвагі службовыя асобы адказныя за грамадзкую бясьпеку. Але калі ўлада хоча, то, ведама, нічога няможнага няма. Гульня адбылася. Але нельга адкінуць, што міжнародных гульняў на стадыёне ня будзе. Асабліва незадавальненьне міжнароднае габрэйскае супольнасьці выклікаў факт, што дэвастацыя могілак тлумачыцца патрэбаю “будаваньня стадыёну, які б адпавядаў эўрапейскім стандартам”. Разуменьне эўрапейскіх стандартаў гарадзенскімі ўладамі і прадстаўнікамі габрэйскіх арганізацыяў відавочна адрозніваецца, і вельмі. Прадстаўнікі габрэйскіх арганізацыяў Вялікабрытаніі і ўжо зьвярнуліся ў ФІФА і ЎЕФА, а таксама да палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў з патрабаваньнем паўплываць на беларускія ўлады дзеля затрыманьня дэвастацыі габрэйскіх могілак. Таму нават калі стадыён, як дакляруе Рышард Кацынэль, адзін з аўтараў праектурэканструкцыі, пабудуюць згодна з эўрапейскімі стандартамі, хучэй за ўсе міжнародных футбольных матчаў на ім ня будзе.

Ці вартая ўтакім разе падобная рэканструкцыя вялікіх грошай, якія выдаткавалі на “эўрапейскія стандарты”, карыстацца якімі будуць адно беларускія гульцы ў футбол?

***Андрэй Адляніцкі***

# Райсавет заблытаўся ў "Павуціне"

*Смаргонскі раённы Савет дэпутатаў пастанавіў стварыць спэцыяльную камісію для праверкі адпаведнасьці запраўднасьці зьвестак скандальнага фільму "Павуціна", які трансьляваўся Беларускаю Тэлевізіяй на мінулым тыдні. Рэч у тым, што ў сюжэце пра недзяржаўныя СМІ фігураваў Рамуальд Улан, заснавальнік "Новае газэты Смаргоні", які на дадзены момант дэпутат гэтага Савету.*



Рамуальд Улан

"Праз тэлевізію двойчы сказалі, што ў нашага дэпутата Ўлана ёсьць рахунак у літоўскім банку, дзе ашчаджаюцца яго грошы. Гэтага рахунку ён не назваў у сваёй дэкларацыі аб даходах, калі быў кандыдатам у дэпутаты," – кажа Мікалай Шыш, старшыня Смаргонскага райсавету. Зь яго слоў Смаргонскі Савет рыхтуе адпаведны запыт у Віленскі банк, дзе паводле зьвестак БТ мусіць быць рахунак Рамуальда Ўлана. "Калі гэта пацьвердзіцца, то ўсё будзе адбывацца паводле закону… Гэта значыць, што Ўлан незаконна абраны дэпутатам. Разьвязаб гэтым прыме Савет і раённая выбарчая камісія, потым зацьвердзіць абласная і, натуральна, рэспубліканская,"– заявіў Мікалай Шыш. Аднак ягонага аптымізму не падзяляюць у Цэнтарвыбаркаме. "Арганізацыя дзейнасьці Саветаў, у тым ліку стварэньне камісіяў не адносіцца да кампэтэнцыі Цэнтравыбаркаму. Ёсьць працэдура адкліканьня дэпутата - тады мы гэтым займаемся. Разам з тым, паданьне недакладных зьвестак пра даходы кандыдата ўдэпутаты няёсьць запэўнаю падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты," – сказала Галіна Мкртчан, галоўны спэцыяліст арганізацыйна-праўнага аддзелу Цэнтравыбаркаму.

Рамуальд Улан зьвязвае такую ўвагу да свае асобы з жаданьнем мясцовай улады зьліквідаваць "Новую газэту Смаргоні". "Уладам не падабаецца нашая газэта і яны ўсе намаганьні прыкладаюць да таго, каб стварыць як мага больш замінаў у нашай дзейнасьці. Як дэпутат я магу атрымоўваць інфармацыю, пэўна гэта не падабаецца. У час сэсіі Савету Мікалай Шыш адкрыта запытаў, ці можа сэсія сваім разьвязам закрыць выданьне. Але начальнік міліцыі яму патлумачыў, што такога права ў Савету няма," – сказаў Рамуальд Улан.

Што да віна вачаньняў уданьні незапраўдных зьвестак аб даходах, дык Улан прызнае, што ў яго ёсьць рахунак у Літве, але гэтую краіну ён не наведваў больш за 2 гады. "Удэкларацыі трэба было пазначаць даходы за 2002 год. Ніякіх даходаў у Літве за гэты час у мяне не было," – даў адпоpower Рамуальд Улан.

**_Андрэй Адляніцкі_**

# Звольнілі "за гайкі"

Інжынэра-тэхноляга РУП "Гарадзенскі Завод Аўтаагрэгатаў" Уладзімера Краўцэвіча звольнілі з работы "за дробную крадзьбу". Уся віна яго ў тым, што, выходзячы з працы, ён забыўся ў сваёй кішэні 2 шрубы, 4 мутэркі і гэтак званы хамут, невялічкую дэталь вагою ня больш за 150 грамаў. Цана такога "дабра" становіць у сярэдня 454 рублі. Але гэтага досіла ня толькі для адміністрацыйнага пакараньня інжынэра, але і для звальненьня яго з працы.

"Я, зразумела ж, ведаў, што на прахадной усталяваная сыстэма "Гвазьдзік", якая рэагуе на жалеза. Але я проста забыўся пра гэтыя гайкі… Ну а потым, ведаючы дрэннае стаўленьне да мяне з боку адміністрацыі… Адным словам, спалохаўся і не прызнаўся, калі спрацавала сыгналізацыя. Пачаў адпірацца…" – кажа Ўладзімер Краўцэвіч. Тое, што адразу пасьля затрыманьня інжынэр заявіў, дзейня ведае, якім спосабам дэталі патрапілі да яго - пазьней стала галоўным аргумэнтам адміністрацыі, якая даводзіць, нібы Краўцэвіч меў намер у красьці памянёных хамут.

"За 26 гадоў мае працы на прадпрыемстве гэта адзіны выпадак падобнага звальненьня", – зазначае Анатоль Хацько, былы старшыня прафкаму заводу. Ён перакананы, дзей запраўдныя прычыны такога жорсткага стаўленьня адміністрацыі заводу да Краўцэвіча тлумачацца тым, што ён быў сябрам прафкаму і колькі разоў выступаў супраць дырэкцыі. "Ідзе плянамерная "зачыстка". Перад акцыянаваньнем заводу звальняюць усіх, хто можа выказаць сваю думку," – лічыць Хацько. Тым часам Уладзімер Краўцэвіч мае послух у працоўнага калектыву. "Я пэўная, што ён запраўды забыўся пра гэтыя дэталі," – кажа Натальля Купрыян, тэхноляг, якая прапрацавала з Краўцэвічам больш за 8 гадоў. Стараньне аб вяртаньні інжынэра на працу падпісалі ўсе, хто працаваў разам зь ім. Аднак ні для адміністрацыі прадпрыемства, ні для суду, куды, шукаючы справядлівасьці зьвярнуўся Краўцэвіч, гэта ня сталася аргумэнтам. Суд Ленінскага раёну Гародні падтрымаў загад аб звальненьні.

"Я пакараны, ня толькі штрафам і звальненьнем, але і тым, што цяпер, маючы ў працоўнай кніжцы запіс аб звальненьні за крадзьбу маёмасьці наймальніка, не магу знайсьці працы," – бядуе Ўладзімер Краўцэвіч.

Паводле слоў працоўных заводу ніякага бытавога выкарыстаньня хамут ня мае. Акрамя таго, у пратаколе аб адміністрацыйным пакараньні і адпаведна ў разьвязе адміністрацыйнага суду, які стаў падставаю для звальненьня, пазначаны хамут зь іншае сэрыі, прасьцей кажучы - іншая дэталь. "З грунту, ня так пазначаны спакмень парушэньня права, апроч таго - кара яўна не адпавядае цяжкасьці парушэньня," – мяркуе Віктар Ус, юрыст Беларускага Хельсінскага Камітэту, які заступаў на судзе інтэарэсы Краўцэвіча. Цяпер юрысты Беларускага Хельсінскага Камітэту рыхтуюць скаргу ў абласны суд, а Ўладзімер Краўцэвіч шукае новага месца працы.

**_Андрэй Пачобут_**

# Народжаны вечнасьць тварыць

*31 ліпеня – 90-ыя ўгодкі з дня нараджэньня краязнаўца, мовазнаўца, пэдагога Міхаіла Петрыкевіча. Гэты сьціплы руплівец беларушчыны нарадзіўся ў вёсцы Падкасоўе на Наваградчыне. Доўгі час працаваў у Валеўцы, значная частка жыцьця Міхаіла Петрыкевіча прайшла на Дзятлаўшчыне. Менавіта ён стаўся стваранынікам і першым дырэктарам Дзятлаўскага краязнаўчага музэю. Апошнія 14 гадоў ажно да сьмерці (6.3.1999) краязнавец стала жыў у Вільні.*



Кожны горад, які чалавек, мае свой пашпарт. Адмысловаю візытоўкаю, пашпартам Дзятлава ёсьць музэй. Музэй, які стварыў Міхаіл Фёдаравіч Петрыкевіч.

Усё пачыналася з нуля. Быў будынак, былі голыя сьцены. Трэба было знайсьці чалавека, энтузыяста музэйнае справы, чалавека апантанага і самаадданага, і яго знайшлі на Наваградчыне. Міхаіл Фёдаравіч Петрыкевіч працаваў загаднікам навучальнае часткі Валеўскае школы. Стварыў у школе невялікі, але цікавы краязнаўчы музэй. Далёка па-за межы Наваградзкага раёну разьнеслася чутка пра нястомнага краязнаўца Петрыкевіча. Таму і прыехалі да яго зь Дзятлава, запрасілі стаць дырэктарам музэю, які арганізаваўся. Так з 1967 году М. Ф. Петрыкевіч стаў працаваць на Дзятлаўшчыне. А ўжо праз год (усяго праз год!) Дзятлаўскі музэй адкрыўся для наведнікаў. Усё, што знайшло тут прапіску, пакалі у зьберта Міхаілам Фёдаравічам у багатую і цікавую экспазыцыю. Гэта быў адзін зь першых музэяў народнае славы ў Рэспубліцы, першых і найлепшых. Так цярплііва, настойліва, так мэтліва і любоў на пазьбіраць музэйныя рэчы мог толькі чалавек, які глыбока і самааддана любіў свой край, Бацькаўшчыну, свой народ. Колькі лістоў было ім напісана, колькі падарожжаў і сустрэчаў зроблена, каб падараваць дзятлаўцам іх гісторыю, падараваць музэй – унікальны помнік матэрыяльнай і духовай культуры краю.

М.Ф. Петрыкевіч быў чалавекам высокае культуры, энцыкляпэдычных ведаў. Пра кожную музэйную рэч, экспанат, падзею Міхаіл Фёдаравіч мог расказаць цікавую і захапляльную гісторыю. Калі ён праводзіў экскурсіі – час для наведнікаў ня доўжыўся, час ляцеў імгненна. Асабліва блізкім для М. Ф. Петрыкевіча быў разьдзел экскурсіі, прысьвечаны побыту і нацыянальна-вызваленчаму руху ў колішняй Заходняй Беларусі. Гэта ставалася для яго нібы вяртаньнем да маладосьці. У 1931 годзе, калі Міхаіл Петрыкевіч быў ў апошнім клясе Наваградзкае гімназіі, яго арыштавалі тагачасныя польскія ўлады за прыналежнасьць да камсамолу Заходняе Беларусі. Наваградзкі акруговы суд вынакаваў яго на тры гады няволі і пазбыў на 10 гадоў усіх грамадзянскіх правоў.

Адсваевылучнае сьціпласьці Міхаіл Фёдаравіч ніколі не расказваў пра сябе, хоць меў пачэсную годнасьць "Заслужанага настаўніка школы БССР", быў узнагароджаны шматлікімі дыплёмамі, ганаровымі граматамі, мэдалямі. Затое зь незвычайнаю цеплынёй і душэўнаю шчодрасьцю ён расказваў пра людзей, якія знайшлі сваё годнае месца ў жыцьці, падавалі́ся ў музэі. Дзякуючы нястомнай шукальнай і дасьледчай рабоце Міхаілу Фёдаравічу ўдалося адкрыць новыя імёны, вярнуць і ўвекавечыць забытую славу многіх людзей. Зь яго ініцыятывы адкрылі многія помнікі, мэмарыяльныя дошкі, вуліцам надалі імёны герояў ці знакамітых землякоў (помнікі-бюсты І.С.Дварчаніну, Я.Я.Фогелю, П.Г.Пятрову, помнік І.Ю.Філідовічу, іншыя). Дзякуючы М.Ф.Петрыкевічу на Дзятлаўшчыне прайшлі знакамітыя і хвалёўныя сустрэчы вэтэранаў дывізіяў, якія ў 1944 годзе вызвалялі Дзятлаўшчыну, вэтэранаў партызанскага руху, сустрэча былых падпольнікаў – сябраў КПЗБ і КСМЗБ. Сустракаліся людзі, якія ня бачыліся дзясяткі гадоў. Асабліва хвалёўныя былі сустрэчы маці з загінуўтымі і пахаванымі на Дзятлаўшчыне сынамі, якіх яны шукалі шмат гадоў. Дырэктар музею, старшыня раённага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, лектар таварыства "Веды", народны засяданьнік Дзятлаўскага суда, актыўны сялькор – гэта далёка ня поўны пералік шматграннай і рознабаковай дзейнасьці М.Ф.Петрыкевіча на Дзятлаўшчыне. Аднак ні напружаная праца, ні шматдзённыя клопаты не астудзілі цеплыні і яго сэрца, шчодрасьці душы. Усе, хто яго ведаў, хто меў шчасьце працаваць зь ім, адзначаюць, што Міхаіл Фёдаравіч быў па-бацькоўску спагадлівы і шчодры, па-дзіцячаму адкрыты і даверлівы. Ён быў дарадцам, настаўнікам у справах рабочых і жыцьцёвых.

З 1985 году М.Ф.Петрыкевіч жыў у Вільні, але не разрываў лучнасьці з роднымі мясьцінамі. Раней часта прыязджаў на Дзятлаўшчыну, потым - толькі пісаў, у лістох даваў парады і прапановы супрацоўнікам Дзятлаўскага музэю наконт стварэньня новых разьдзелаў экспазыцыі. Экспазыцыя адкрылася, але ўбачыць яе Міхаілу Фёдаравічу было не суджана. 6 сакавіка 1999 году яго ня стала... Ня стала чалавека прыгожае і сьветлае душы.

У маі 2003 году ў Дзятлаўскім гістарычна-краязнаўчым музэі адкрылася выстава "Сьлед на зямлі", пачэснае месца на якой займае Міхаіл Фёдаравіч Петрыкевіч, першы дырэктар і стваральнік музэю. Чалавек, які пакінуў адметны, вечны сьлед на зямлі.

*Такія прыгожыя людзі народжаны*
*вечнасьць тварыць,*
*Такія прыгожыя людзі народжаны*
*вечна жыць.*

**Тамара Палховіч,**
**навуковая супрацоўніца**
**Дзятлаўскага музэю**

# Канцэпцыя разьвіцьця асноў мясцовага кіраваньня і самакіраваньня ў Рэспубліцы Беларусь

*(укладзеная экспэртамі “Фонду імя Льва Сапегі)*

*(працяг, пачатак у нумарох 1-7)*

### *Паўнамоцтвы кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду*

1. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду зьяўляе інтарэсы насельніцтва абшчыны/гораду ў юрыдычных угодах і ў адміністрацыйнай дзейнасьці.

2. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня адказны за кіраўніцтва і кантроль за дзейнасьцю муніцыпальнай службы. Ён рэгулюе ўласна арганізацыю кіраваньня і размяркоўвае службовыя абавязкі. Ён можа захаваць за сабою выкананьне пэўных заданьняў і рыхтоўлю пэўных пытаньняў.

3. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня бярэ на сваю адказнасьць пільныя справы кіраваньня і ўжыцьцяўляе перададзеныя яму дадатковыя заданьні. У скрайне пільных пытаньнях, разьвязаньне якіхня можа быць адкладзенае да сьпешнага скліканьня нечарговага паседжаньня прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня ці яго выканаўчага камітэту, кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня мае права прыняць уласны разьвяз замест разьвязу прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня ці выканаўчага камітэту. Такая пастанова мусіць падавацца на зацьверджаньне на наступным паседжаньні прадстаўнічага органу. Пастанова можа скасоўвацца, адно тады, калі ў зьвязку з ьяго рэалізацыяй ужо не паўсталі правы трэціх асобаў.

4. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня рыхтуе пытаньні для абмеркаваньня ў камітэтах і праекты пастаноў прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня. Ён выконвае паўнамоцтвы ў ужыцьцяўленьні заданьняў, перададзеныхім ўадпаведнасьці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Ён ужыцьцяўляе пастановы прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня пад кантролем прадстаўнічага органу і з адказнасьцю перад ім.

5. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня рэгулюе дзейнасьць муніцыпальных службоўцаў.

### *Абавязкі кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду*

1. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду бярэ ўдзел у паседжаньнях прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня. Ён мае права і з патрабаваньня адной пятай сябраў прадстаўнічага органу ці яе фракцыі абавязаны выказваць сваё меркаваньне ў адным з пытаньняў павесткі дня перад паседжаньнем прадстаўнічага органу. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду абавязаны таксама браць удзел у паседжаньнях камітэтаў, калі таго запатрабуе бальшыня дэпутатаў.

2. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду абавязаны інфармаваць прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня пра ўсе важныя справы абшчыны/гораду. Пра пляны і праекты прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня павінен быць у час інфармаваны пра намеры і прапановы выканаўчых органаў, а таксама пра бягучы стан і зьмест плянавых работ.

3. Абвесткі, якія абавязковыя для насельніцтва абшчыны/гораду павінны складацца пісьмова і падпісвацца кіраўніком муніцыпальнага ўтварэньня. Інакш складзеныя абвесткі ня маюць моцы ў дачыненьні да трэціх асобаў. Калі зь якіх-колечы прычынаў кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня не дае рады ўласнаручна падпісаць забавязальнае абвесткі, то такая абвестка мае юрыдычную моц толькі ў тым разе, калі яна падпісаная першым намесьнікам кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня і яго другім намесьнікам.

### *Намесьнікі кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду*

Прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня абірае першага намесьніка ўякасьці намесьніка ў агульных пытаньнях кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду і астатніх намесьнікаў. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду зьяўляе адпаведныя пэрсанальныя прапановы. У разе, калі кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду ня можа выконваць сваіх абавязкаў, да яго першага намесьніка пераходзяць паўнамоцтвы ў усіх пытаньнях, якія мусяць ўжыцьцяўляцца паводле пастаноў прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня, а таксама паводле юрыдычных угодаў і пытаньняў кіраваньня. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду вызначае пасьлядоўнасьць, у якой яго іншыя намесьнікі могуць выконваць яго абавязкі тады, калі ён сам і яго першы намесьнік ня могуць выконваць сваіх абавязкаў. У паўнамоцтвы кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня уходзіць прыманьне на працу іншых суб’ектаў муніцыпальнае службы, іх падвышэньне ў службе і звальненьне. Павінны выконвацца прынятыя прадстаўнічым органам штатны расклад муніцыпальных службоўцаў і настанова пра агульныя прынцыпы прыманьня на працу, падвышэньня ў службе, звальненьня і грашовага ўзнагароджваньня для муніцыпальных службоўцаў, якія ёсьць у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

### *Пастановы прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня, пярэчаньні і апратэставаньне*

Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду можа заявіць пярэчаньне супраць пастановы прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня, калі ён



лічыць, што такое разьвязаньне пярэчыць інтарэсам абшчыны/гораду. Пярэчаньне з абгрунтаваньнем мусіць падавацца ўдва тыдні. Пярэчаньне мае адкладальнае дзеяньне. Прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня мусіць паўторна і на гэты раз канчаткова знайсьці разьвязаньне ўданым пытаньні.

Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду можа апратэставаць пастанову прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня, калі такая пастанова супярэчыць існаму заканадаўству. Пратэст з абгрунтаваньнем мусіць падавацца пісьмова ў два тыдні. Пратэст мае адкладальнае дзеяньне. Калі прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня пры паўторным абмеркаваньні пакідае папярэднее разьвязаньне, то кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду мусіць зьвярнуцца ў суд.

### *Вызваленьне ад пасады кіраўніка муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду*

Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня, абраны насельніцтвам, можа вызваляцца ад пасады да зыходу тэрміну паўнамоцтваў грамадзянамі абшчыны/гораду. Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня вызваляецца ад пасады на наступны дзень пасьля зацьверджаньня выбарчай камісіяй адпаведных вынікаў галасаваньня. Да зыходу тэрміну сваіх вычарпаных паўнамоцтваў ён атрымвае кампэнсацыю, якая вызначаецца прадстаўнічым органам мясцовага самакіраваньня. Прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня большасьцю галасоў можа прыняць пастанову, каб кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня абшчыны/гораду не выконваў сваіх абавязкаў праз увесь тэрмін адхіленьня з пасады. (*Альтэрнатыва:* Кіраўнік муніцыпальнага ўтварэньня, абраны прадстаўнічым органам мясцовага самакіраваньня. Прапанова пра адхіленьне ад пасады можа прымацца толькі большасьцю галасоў усіх сябраў прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня. Паміж складаньнем такой прапановы і паседжаньнем прадстаўнічага органу мясцовага самакіраваньня мусіць прайсьці ня менш як чатыры тыдні. Прапанова ставіцца на таемнае галасаваньне без папярэдняга абмеркаваньня. Пастанова прадстаўнічага органу пра адхіленьне ад пасады можа прымацца ня менш чым дзвюмя трацінамі ўсіх сябраў прадстаўнічага органу).

# Беларусы Беласточчыны ў выбарах пасьля 1989 году

*“СЛ” працягвае рэтраспэктыўны агляд удзелу беларусаў Беласточчыны ў выбарах рознага роўню ў Польшчы апошніх пятнаццаці гадоў. Упэўнены, што аналіз Міхася Андрасюка будзе цікавы ўсім, хто цікавіцца грамадзка-палітычным жыцьцём беларусаў у блізкім замежжы. Як заўсёды, захоўваем стыль і правапіс аўтара.*

***Парляменцкія выбары 1997***

Да чарговых парляментарных выбараў у 1997 годзе беларусы выйшлі ў трох камітэтах. Беларускае грамадска-культурнае таварыства з Саюзам левых дэмакратаў, Яўген Чыквін паклікаў свой камітэт Stowarzyszenie Siowiacskiej Mniejszości Narodowej – Prawosiawni, (Аб'яднанне славянскай нацыянальнай меншасці праваслаўныя), а Беларускі саюз, змясціўшы свайго прадстаўніка Яўгена Вапу на спіску Уніі працы, у кааліцыі менавіта з гэтай партыяй. З пункту гледжання беларускіх дэмакратычных арганізацыяў (менавіта яны і аб'ядналіся ў Беларускі саюз), такі ход паказаўся вельмі трапным. Унія працы ў той час была ў польскім парляменце, ад выбарчыя меркаванні паказвалі на поспеху актуальных выбарах. Што таксама важнае і Беларускі саюз і Унія працы адклікаліся да адных і тых жа дэмакратычных вартасцяў. Партыя з левым ухілам, але без камуністычнай спадчыны з давалася таксама ўспрымальнай беларускаму электарату. Аднак якраз гэтыя выбары давялі да значнай кансалідацыі польскай палітычнай сцэны. Паколькі раней у польскім парляменце было пад дзесяць невялікіх партыяў, зараз электарат выказаўся за самыя яркія так з левага, як і правага боку. Пераможцамі выймшi перш за ўсё правыя сілы аб'яднаныя ў Выбарчую акцыю Салідарнасць, а таксама Саюз левых дэмакратаў. Невялікія партыі, у тым ліку і Унія працы не пераадолелі пастаўлены выбарчым законам пяціпрацэнтны парог. Яўген Вапа узяўшы 2023 галасы, апынуўся на другім месцы свайго спіска, але ў Парлямент, як і ўся Унія працы не ўвайшоў. Знайшліся ў Сойме беларускія прадстаўнікі старой наменклятуры, хто балатаваўся ад левых дэмакратаў. Дзякуй знакамітаму рэзультату Уладзімежа Цімашэвіча, сталі пасламі Сяргей Плева (2135 галасоў) і Ян Сычэўскі (1688 галасоў). Выбары ў Сенат традыцыйна ўжо выйгралі кандыдаты каталіцкага электарату (Ян Хойноўскі 132 000 галасоў). За беларускага кандыдата Міхала Кандрацюка галасавалі 27 482 асобы.

Выбарчы камітэт славянскіх меншасцяў набраў 13 632 галасы і таксама апынуўся ў пройгрышы.

Варта сказаць, што пасля гэтых выбараў шмат якія партыі перасталі існаваць, або рэзка змянілі свой накірунак. Як прыклад менавіта Унія працы, якая выратоўваючыся ад небыцця пайшла на поўнае кааліцыйнае супрацоўніцтва з посткамуністычным Саюзам левых дэмакратаў.

***Выбары ў самакіраванне 1998 год. Парляменцкія 2001***

Як і чатыры гады раней, на Беласточчыне не паклікаўся ніадзін беларускі камітэт, які б каардынаваў працу камітэтаў лакальных. У Беластоку Праваслаўны выбарчы камітэт пайшоў да выбараў у кааліцыі з левымі дэмакратамі. Камітэт называўся BKS Lewica i Niezaleïni Razem, атрымаў 25 тысяч галасоў у тым ліку 8 тысяч праваслаўныя, гэта пераліčылася на 18 мандатаў (праваслаўныя 8). У Бельску Падляскім надалей спрацавала Бельская кааліцыя (СЛД, Беларускі выбарчы камітэт і Саюз украінцаў Падляшша). Перамагла яна ў выбарах (17 з 28 мандатаў, у тым 7 беларускі камітэт), а бурмістрам на чарговыя чатыры гады астаўся Андрэй Сцепанюк ад Беларускага камітэта. У Гайнаўцы Беларуска народны выбарчы камітэт прыступіў да выбараў як самастойная структура. Некалькі слоў чаму Беларуска народны. Менавіта таму, што камітэт заснoўваўся як нефармальная кааліцыя з Польскай сялянскай партыяй ПСЛ. Нефармальная, бо польскі выбарчы закон забараняе кааліцыю між палітычнымі партыямі а грамадскімі выбарчымі камітэтамі. Гайнаўскія сябры ПСЛ знайшліся тады на выбарчых спісках, як прыватныя асобы, а пры тым, гэта ж у прынцыпе праваслаўныя беларусы.

Камітэт рэкамендаваў сваіх кандыдатаў у Раду горада і павета, а таксама, вяртаючыся да вытокаў, да 1990 га, у некаторых гмінах Гайнаўшчыны. Здабываючы 1767 галасоў і 7 з 28 мандатаў у горадзе, Беларускі камітэт паказаўся як трэцяя сіла за левымі дэмакратамі і Салідарнасцю. Паколькі пася выбараў ніякі камітэт не быў у змозе сам узяць уладу між беларусамі а левымі дэмакратамі было падпісана кааліцыйнае пагадненне. У рэзультаце Беларускі камітэт атрымаў магчымасць кіраваць горадам.

Ад беларускага камітэта быў паклікаты намеснік бурмістра і старшыня рады. У Раду гайнаўскага павета ад Беларускага камітэта ўвайшлі пяць асоб. Перамаглі тут левыя дэмакраты (16 з 25 мандатаў) і менавіта яны ўзялі ўладу. Хаця, прымушаныя сітуацыяй у радзе горада, аддалі адно месца ў пяціасабовым праўленні).

У гмінах Гайнаўшчыны, ад Беларускага камітэта выступалі 29 кандыдатаў. Паспяхова прайшлі выбары дзесяць асоб. Гэта няшмат, значэнне радных з увагі на факт, што ў паасобных радах апынуліся яны ў меншасці таксама нельга перабольшваць. Аднак важнае усвядомасць вясковага электарату вяртаўся беларускі фактар.

У 1998 адбыліся таксама ўпершыню выбары ў ваяводскія соймікі. У гэтых выбарах беларускія камітэты не прынялі ўдзел. Паасобныя кандыдаты перш за ўсё ад старой, камуністычнай яшчэ наменклятуры знайшліся на спісках Саюза левых дэмакратаў. Такім чынам знайшоўся ў Падляскім Сойміку Ян Зенюк, царкоўна беларускі дзеяч.

Перад самаўрадавымі выбарамі 1998 га года, радыкальна мяняючы фронт, актыўную прапаганду ўкарысць Левых дэмакратаў праводзіў Яўген Чыквін раней незалежны кандыдат праваслаўных камітэтаў. І ў чарговых парляменцкіх выбарах, у 2001 годзе, праваслаўныя камітэты ўпершыню не пайшлі самастойна. Яўген Чыквін паспяхова балаціраваўся ў Сойм ад левых дэмакратаў. У групе сваіх партыйных калег набраў другі, за Уладзімежам Цімашэвічам рэзультат. Як кандыдаты ў Сенат ад левых дэмакратаў прадбачваліся два беларусы, дарэчы у той час паслы ў Сойм Сяргей Плева і Ян Сычэўскі. Аднак апошні, у рэзультаце выкліканага падчас пабыўкі ў Меску скандалу, быў выкінуты з партыйнага спіска. Паклікаўшы ўласны выбарчы камітэт прабаваў увайсці ў Сенат на сваю руку, але без поспехаў. У 1998 права каталіцкія кандыдаты на Падляшшы, упершыню прайгралі змаганне за Сенат. У гэтых выбарах Сяргей Плева набраў каля ста дваццаці тысяч галасоў, што ўспрымалася, як агромная сенсацыя.

У маштабе краіны ў выбарах перамагла кааліцыя СЛД Унія працы. Дапамог тут і правы бок, рассыпаўся дробным макам і пайшоў да выбараў дзесяткам малаважных груповак.

Беларускія дэмакратычныя арганізацыі, рэальна ацаніўшы свае магчымасці, у гэтых выбарах не прынялі ўдзел. Маральную падтрымку атрымаў адно старшыня Беларускага аб'яднання студэнтаў Андрэй Карчэўскі, які кандыдаваў у Сойм ад Уніі Вольнасці. Без вынікова, бо якраз гэтая партыя ў 2001 годзе апынулася ў вельмі складаным становішчы.



*Музэй і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы, 2001 г.*



*Бераставіцкі раён – колішняя частка Ваўкавыскага павету, край урадлівае зямлі. Можа таму некалі ў гэтым рэгіёне так шчыльна размяшчаліся прыватныя маёнткі зь сядзібамі. Зазвычай такія фальваркі складаліся з дому, гаспадарчых пабудоў, якія атачалі парк з садам.*

*Да сёньняшняга часу праз віхуры войнаў і часу ацалела няшмат, тое ж, што ёсьць - патрабуе рэстаўрацыі. Будзем спадзявацца, што надыдзе пара, калі мясцовая ўлада возьмецца за адбудову помнікаў архітэктуры.*

Сярод дайных прыватнаўласьніцкіх сядзібаў назавем наступныя. **Кватары**, якія ведамыя зь 17 ст., належалі роду Гліндзічаў. Уладаньнік маёнтку Антон Гліндзіч быў арыштаваны ў 1963 годзе за ўдзел у нацыянальна-вызвольным паўстаньні, у час сьледзтва ён памёр у Ваўкавыскай турме. Да гэтага часу гэтая асоба не ўшанаваная. У **Макараўцах** была сядзіба Хрусьціцкіх; у **Малой Бераставіцы** – Ваўкавыцкіх, апошняга яе ўладаньніка забілі ў 1939 г.; у **Масалянах** – сядзіба (1830-ыя) з паркам (19 ст.), якая належала Бісьпінгам. Цікавыя сядзібы былі ў **Мураване** (канец 18-1-я пал. 19 ст.), яна да 1858 г. належала Юндзілам, а пасьля аж да 1939 г. – Солтанам; **Старым Дварцы** (19 ст.). Назвы некаторых сёньняшніх вёсак, ведамых з 16 стагоддзя паходзяць ад прозьвішчаў іх уладаньнікаў – **Мацеевічы**, **Станевічы**, **Ярмолічы**.

У канфэсійным пляне насельніцтва раёну сёньня складаецца пераважна з праваслаўных і каталікоў рымска-каталіцкага вызнаньня.



*царква ў Алекшыцах*

Да сярэдзіны 19 ст. у рэгіёне, як і ўва ўсёй Заходняй Беларусі, было багата ўніятаў. Прыкладам, Марыяна Бісьпінг фундавала ў 1796 пабудову ўніяцкай царквы ў **Масалянах** (захавалася, цяпер праваслаўная).

Пералічым сама ведамыя на Бераставіччыне храмы, якія ёсьць. З праваслаўных цэркваў гэта Сьвята-Пакроўская ў **Алекшыцах** (1865-71), Сьвята-Ульпенская ў **Гольнях** (1903), Крыжаўзьвіжанская ў **Клепачох** (1885), Дзьмітрыеўская ў **Малой Бераставіцы** (1866). З каталіцкіх пабудоў можна вылучыць наступныя: касьцёл Ушэсьця Дзевы Марыі ў **Вялікіх Эйсмантах** (1850, заснаваны ксяндзом Міхалам



*царква ў Масалянах*



*касьцёл у Бераставіцы*

Сезяноўскім); касьцёл Узьвіжаньня Сьв. Крыжа ў **Макараўцах** (1795, быў пабудаваны побач зь сядзібаю Хрусьціцкага); **малабераставіцкі** касьцёл Сьв. Антоні Падуанскага (1851-63, пабудаваны з фундацыі А. Ваўкавыцкага). Асобная гаворка пра велічны касьцёл Візытацыі Дзевы Марыі ў **Вялікай Бераставіцы**. Пабудаваны ён быў каля 1615 г. з фундацыі Геранімa Хадкевіча. У 1741 на перабудову храма ў грошы выдаткаваў кракаўскі кашталян Юры Мнішак. У 1794 г. пры касьцёле быў шпіталь, які заснавала Ю. Патоцкая, у другой пал. 18 – першай пал. 19 ст. дзеіла школа. У касьцёле захоўваўся абраз (1797-1807), які



*касьцёл у Малой Бераставіцы*

намаляваў Францішак Смуглевіч. Пад касьцёлам крыпта зь дзевяці злучаных памяшканьняў. Некалі ў сутарэньнях быў саркафаг з сэрцам гетмана Яна Караля Хадкевіча. З 1866 г. храм перадалі праваслаўным, пасьля 1918 г. вернулі каталіком. Пасьля другой сусьветнае вайны - зачынілі, пазьней саветы прыстасавалі пад тытунёвую краму. Толькі ў 1990 г. касьцёл аддалі вернікам, але ў 1992 г. храм моцна пашкодзіў пажар. Сёньня, калі ў Беларусі ідзе адбудова многіх хрысьціянскіх сьвятыняў, сродкаў на рэстаўрацыю велічнага бераставіцкага помніка дойлідзтва, нажаль, пакуль што не стае.

***Падрыхтаваў Уладзімер Хільмановіч, фота аўтара***

# Партрэты знаных і нязнаных…



Новы твор Андрэя Чэмера "Партрэты" - пацьвярджае яго адданасьць дакумэнталістыцы. 400 старонак запоўненыя рэдкімі здымкамі, допісамі праведамых людзей: братоў Юрку і Лявона Луцкевічаў, магістра Янку Шутовіча, Яна Цеханоўскага, Паўла Карузa, Аўгена Калубовіча, архімандрыта Льва Гарошку, Янку Багдановіча, Пятра Орсу, Пятра Конюха, Леаніда Мурашку…

*Беларускі пісьменьнік зь Вільні Андрэй Чэмер (Аляксей Анішчык) часьцяком наведвае Гародню. Тут у свой час на сходзе грамадзкасьці прэзэнтаваў кнігу "Выбраныя Богам", прысьвечаную сусьветна ведамаму вучонаму, ураджэнцу Наваградчыны Барысу Кіту. Цікавасьць тутбытных грыцягнулі таксама зборнікі Андрэя Чэмера "Наваградзкая гімназія" і "Сяргей Хмара".*

Кніга ня толькі ўспамін пра людзей, якіх Андрэй Чэмер ведаў з даваеннага і ваеннага часу. Цёплыя словы ён адрасуе Станіславу Шушкевічу, Максіму Танку, Уладзімеру Караткевічу, Віктару Роўдзе, Казімеры Прунскене, Міколу Ермаловічу, Рыгору Барадуліну, шматлікім "літоўскім" беларусам.

Ёсьць у кнізе частка, дзе аўтар мімаходзь успамінае і сваё пражытае. Гэта савецкі ГУЛАГ, на які яго засудзілі (нарыс "Зьвяр'ё").

Віленскаму Беларускаму музэю аўтар прысьвяціў публікацыю "Беларуская Мэкка". Крыўдна, што наш народ страціў каштоўныя рэчы, зьбертыя патрыётам і палітычным дзеячам Іванам Луцкевічам. Ні літоўцы, ні расейцы не пару пілісяпра сьведчаньні беларускае даўніны. Ім наша памяць не спатрэбілася. Не спатрэбілася і савецкім беларусам зь Менску. Замест дапамогі арыштавалі і заслалі ў лягеры дырэктара музэю Янку Шутовіча. Такі прапала яскравае сьведчаньне беларускае міну ўшчыны. Засталіся толькі два тамы інвэнтарнае кнігі, дзе пералічаны здабытак музэю. Крыўдна і балюча чытаць тыя радкі. Там было шмат экспанатаў, зьбертых у нас, на Гарадзеншчыне…

Пра Гарадзеншчыну Андрэй Чэмер успамінае часта. Многія героі яго кнігі – ураджэнцы тутэйшых мясцін, які ён сам. Іншыя тут выявілі свае найлепшыя якасьці. Так, выкладнік Гарадзенскага пэдінстыту Браніслаў Андрэевіч Ржэўскі ў канцы 40-х напісаў заяву ў Маскву з прапановаю вучыць студэнтаў па-беларуску. Замест адказу яго арыштавалі і засудзілі на 10 гадоў лягераў Дубраўлягу (Мардовія). Па рэабілітацыі на ранейшае месца работы яго не ўзялі.

Такія выданьні каштоўныя тым, што дакумэнтальна расказваюць пра лёсы людзей. Шмат каго ўжо няма на гэтым сьвеце. А памяць пра іх жыве, дзякуючы няўрымсьлівым дасьледнікам. Андрэй Чэмер з гэтай слаўнае кагорты.

19 ліпеня шаноўнаму Аляксею Сьцяпанавічу Анішчыку (Андрэю Чэмеру) спаўняецца 81 год. Здароўя Вам і надзейных паплечнікаў!

Гародню літаратар наведаў на пачатку чэрвеня гэтага году.

***Антон Лабовіч***

## Яўген Вапа: "Спадзяваўся дзед на мёд – то лёг спаць ня еўшы"

*(заканчэньне, пачатак на с.3)*

***-Імя Яўгена Вапы добра ведамае з таго часу, калі сканаў СССР і адкрыліся межы...***

Для нашага Беларускага Зьвязу вельмі важнае спрыяньне беларускай культуры ў Польшчы. Грамадзяне Польшчы мусяць у бачыць, што нашая культура, нашыя дзеячы гэтаксама цікавыя, як і эўрапейскія. Спрыяньне беларускай культуры, літаратуры, людзям - адзін з найважнейшых кірункаў нашае дзейнасьці. Адсюль вынікаюць цесныя кантакты з Беларусьсю арганізацыяў, паяднаных у Беларускім Зьвязе. Кожная мае свае сяброўскія дачыненьні з грамадзкімі арганізацыямі Беларусі: пісьменьнікі зь пісьменьнікамі, гісторыкі з гісторыкамі, моладзь з моладзю. Дзякуючы гэтаму ўсталявалася шмат цесных і дзейсных кантактаў.

Думаю, што мяжа, якая паўстала паміж Беларусьсю і Эўразьвязам, можа паслабіць кантакты, але не разарваць. Аднак, дзе б ні жыла нацыянальная меншасьць, яна ня можа разьвязваць глябальныя ці стратэгічныя праблемы дзяржавы. Нацыянальная меншасьць ня можа істотна дапамагчы мэтраполіі – наадварот, падтрыму вымагае дыяспара. Пра гэтау Беларусі бальшасьць ня хоча думаць. У нацыянальных меншасьцяў іншая місія: яны найлепшыя паслы дзяржавы ў чужых краінах.

***- Як ты бачыш будучыню нашае дзяржаўнасьці і этнасу?***

Гэта пытаньне, на якое адкажа сам беларускі народ, у яго руках лёс культуры, сёньня і ўбудучні. Самыя беларусы ў Беларусі мусяць вызначаць гэтыя шляхі. Спадзяюся, калі хто зьвернецца да архіўных падшывак "Свайго Ладу" праз 50 ці 100 гадоў, ён зразу мее сёньняшнія праблемы, але, веру, іх ня будзе ў наступнасьці.

***Распытваў Віктар Сазонаў***



бюлетэнь «СВОЙ ЛАД»
выходзіць 1 раз у месяц
наклад 299 асобнікаў
для нутранога карыстаньня
распаўсюджваецца задарма
пры перадруку спасылка абавязковая

рэдактар - Віктар Сазонаў
стылёвае рэдагаваньне - Юры Пацюпа
шыхтоўля - Зьміцер Дулько
падрыхтаваны да друку: 17. 07. 2003
тэл. 44-24-97, e-mail: sazonau@tut.by
адрас для ліставаньня: 230023, Гародня, а\с 121



Гарадзенскае аддзяленьне ГА «Фонд імя Льва Сапегі»